З каталіцкага друку (129)

Аўтар: Кінга Красіцкая
04.12.2016 00:00

Папа Францішак
зацвердзіў тэму
Сусветных дзён моладзі

Гэта будуць словы Найсвяцейшай Панны Марыі з Евангелля паводле Лукі: “Вось я, слуга Пана. Няхай мне станецца паводле твайго слова” (Лк 1, 38).
Падрыхтоўка да сусветнага спаткання маладых людзей, што пройдзе ў Панаме ў 2019 годзе, ужо распачалася. Вядома, што часам правядзення форуму будзе не лета, а студзень, люты або сакавік, так як у звычайную для яго арганізацыі пару ў краіне сезон дажджоў.

Акрамя таго, Пантыфікам зацверджаны тэмы Дзён моладзі, якія ў бліжэйшыя два гады будуць адзначацца на дыяцэзіяльным узроўні. Яны таксама прысвечаны Марыі. †

Падтрымаць
дабрачынныя ініцыятывы
можна ў інтэрнэце

Цяпер ахвяраванні, якія будуць накіраваны Пантыфікам на рэалізацыю канкрэтных спраў міласэрнасці, можна рабіць з дапамогай адмысловага сайта obolodisanpietro.va, які быў створаны ў Ватыкане. Назва рэсурса нагадвае пра традыцыйны збор ахвяраванняў, вядомы як “Грош св. Пятра” (штогод праходзіць ва ўрачыстасць свсв. апап. Пятра і Паўла). Акрамя прапанаванай магчымасці пэўным чынам удзельнічаць у ініцыятывах міласэрнасці Святога Айца, на сайце можна пазнаёміцца з некаторымі дабрачыннымі праектамі Святога Пасаду і прамовамі Папы на тэму міласэрнасці.

Польшча

прыняла Хрыста
Валадаром і Панам

На ўрачыстасці прысутнічалі біскупы, святары, кансэкраваныя і свецкія асобы, у тым ліку прадстаўнікі ўлады на чале з прэзідэнтам Анджэем Дудам.

“Юбілейны акт прыняцця Езуса Хрыста Валадаром і Панам – Вялікая хартыя свядомасці, пастаў і дзеяння для ўсіх палякаў, якія вызнаюць Хрыста”, – сказаў кардынал Станіслаў Дзівіш у слове, што папярэджвала публічную пракламацыю акту. Іерарх падкрэсліў, што цяпер перад кожным стаіць заданне, каб Евангелле ўплывала на аса- бістае жыццё, на кожны фундаментальны і штодзённы выбар.